
KIRKMAN • ADLARD • RATHBURN
THE WALKING DEAD
37
$2.99
$3.50 CAN
image
.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
ХАДЗЯЧЫЯ МЕРЦВЯКІ #37 (2003)
ПЕРАКЛАД І АФАРМЛЕННЕ: COMICSBY.BY


The Calm Before
Зацішша перад...
ЧАСТКА 1(6)


О, ШЭЙН...


КАРЛ У ПАРАДКУ. ЁН УСЁ ЯШЧЭ СПІЦЬ НА ЗАДНІМ СЯДЗЕННІ.
ЛОРЫ?
ДЗЯКУЙ, ШТО ПРАВЕРЫЎ ЯГО, ШЭЙН. ПРАБАЧ, Я... Я ПРОСТА ЗАДУМАЛАСЯ.
ЗАМЕРЗЛА?
ТЫ Ў ПАРАДКУ?
НЕ... АЛЕ ЎСЁ РОЎНА ДЗЯКУЙ.
ПАКУЛЬ МЫ БЫЛІ ТУТ...
Я ЗАБЫЎ АБА ЎСІМ. Я ЗАБЫЎ... І ПРОСТА БЫЎ ТУТ.
ДЗЯКУЙ ЗА ГЭТА.
ДЛЯ МЕНЯ ГЭТА БЫЛО ШТОСЬЦІ, ЛОРЫ. ШТОСЬЦІ...
АСАБЛІВАЕ.
МАЕ БАЦЬКІ ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ **ЗАГІНУЛІ**.
МЫ ПРЫЕХАЛІ СЮДЫ ДАРЭМНА. КІНУЛІ РЫКА З КУПАЙ **ЧУЖЫХ** ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ КЛАПАЦЯЦЦА ЗА ЯГО... ДАРЭМНА.
ТЫ **ЎПЭЎНЕНЫ**, ШТО МЫ ПАВІННЫ **ЗАСТАВАЦЦА** ТУТ?
ПАВЕР МНЕ... КАЛІ ЎЛАДЫ БУДУЦЬ ГАТОВЫ РАЗАБРАЦЦА З ГЭТЫМ БАРДАКОМ... ЯНЫ ПАЧНУЦЬ З ГАРАДОЎ. ТАМУ ГЭТА САМАЕ БЯСПЕЧНАЕ МЕСЦА.
А РЫК У ШПІТАЛЕ... ПАД ПРЫГЛЯДАМ. У ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ МЫ НІЧЫМ НЕ МАГЛІ ДАПАМАГЦІ ЯМУ.
КАЛІ ШТО... МЫ ЗМОЖАМ АТРЫМАЦЬ ПРАВІЗІЮ Ў САЛДАТ, КАЛІ ЯНЫ ПРЫЙДУЦЬ. БОГ ВЕДАЕ, КОЛЬКІ ЧАСУ СПАТРЭБІЦЦА ВАЙСКАМ, КАБ ДАБРАЦЦА ДА НАШАГА МАЛЕНЬКАГА ГАРАДКА.
ВЕР МНЕ.
ПРАБАЧ, ШЭЙН. ПРАБАЧ Я... Я НЕ МАГЛА НІЧЫМ ДАПАМАГЦІ, АЛЕ ЎСЁ РОЎНА АДЧУВАЮ **ВІНУ** ЗА ТОЕ, ШТО КІНУЛА ЯГО. І ЗАРАЗ... ПАСЛЯ ТАГО, ЧЫМ МЫ ТОЛЬКІ ШТО **ЗАЙМАЛІСЯ**.
...
А ШТО НАКОНТ НАС? КАЛІ ГЭТА ШАЛЕНСТВА СКОНЧЫЦЦА... КАЛІ ЎСЁ ВЕРНЕЦЦА ДА НОРМЫ І ЎСЕ ГЭТЫЯ МОНСТРЫ ПЕРАДОХНУЦЬ... ШТО ТАДЫ?
ТЫ РАСКАЖАШ ЯМУ ПРА НАС?
КАЛІ РЫК ПРАЧНЕЦЦА... КАЛІ ЁН БУДЗЕ Ў ПАРАДКУ... КАЛІ МЫ ВЕРНЕМСЯ ДАДОМУ...
НЯ ВЕДАЮ.


АБ ЧЫМ ЗАДУМАЛАСЯ?
ШТО?
МЫ КАЗАЛІ ПРА АТЛАНТУ.... КАЛІ Я ЎПЕРШЫНЮ ЎБАЧЫЎ ВАС У ЛАГЕРЫ. А ПОТЫМ ТЫ ЗАМАЎЧАЛА.
АБ ЧЫМ ТЫ ДУМАЛА?


НІ АБ ЧЫМ.
ПРОСТА...
ПРАЙШЛО ЎЖО ШМАТ МЕСЯЦАЎ. Я ПРОСТА ДУМАЛА ПРА ІХ.
У КАРЛА ЦЯПЕР СВОЙ ЎЛАСНЫ ПАКОЙ... ДОБРА.
ЯШЧЭ НА АДЗІН КРОК БЛІЖЭЙ ДА НОРМЫ.
ТАК, Я... УНГХ.
ПАЧАЛОСЯ? ПАТРЭБНА ДАПАМОГА?
Я Ў ПАРАДКУ.
ПАСЛЯ ТВАЙГО АПОШНЯГА ЎХОДА... КАЛІ ТЫ БЫЎ У ВУДБЭРЫ... Я НАВАТ НЕ ДУМАЛА, ШТО ЁН ЗМОЖА СПАЦЬ АДЗІН.
ТАК ПРЫЕМНА ЧАСАМ ЗАСТАВАЦЦА САМ НА САМ З ТАБОЙ.
ОХ!
ЗНОЎ ДЗІЦЯ?
ТАК, СЁННЯ ЁН ЖУДАСНА Б'ЕЦЦА.
ЁН...
НУ ВОСЬ Я ЗНОЎ ГЭТА ЗРАБІЛА, ТАК? НЕ МАГУ СПЫНІЦЦА НАЗЫВАЦЬ ЯГО «ЁН». Я Ж НЕ МАГУ КАЗАЦЬ «ЯНО». МЫ Ж НЕ ВЕДАЕМ НАПЭЎНА... ТАК? ГЭТА МОЖА БЫЦЬ ДЗЯЎЧЫНКА. БЫЛО Б МІЛА... У НАС БЫЛІ Б АБОДВА.
ШКАДА, ШТО МЫ НЕ ВЕДАЕМ.
У НАС НЯМА ДЗІЦЯЧАЙ, КАБ ПАФАРБАВАЦЬ ЯЕ Ў ПАТРЭБНЫ КОЛЕР... НІЧОГА НЯМА.
Я ЗРАБЛЮ ЛОЖАК... КАЛЫСКУ... ШТО ЗАЎГОДНА.
Я БЫЎ ТАК ЗАНЯТЫ ЎСІМ АСТАТНІМ... ШТО НАВАТ НЕ ПАДУМАЎ ПРА ЎСЕ ГЭТЫЯ РЭЧЫ.
НАМ СТОЛЬКІ ЎСЯГО ТРЭБА... ТАК ШМАТ ТРЭБА БУДЗЕ ЗРАБІЦЬ.
СУПАКОЙСЯ... УСЁ БУДЗЕ ДОБРА. У НАС ЯШЧЭ ЁСЦЬ ЧАС.
УЖО ПОЗНА... ЗАЎТРА БУДЗЕ ЦЯЖКІ ДЗЕНЬ... ТРЭБА ТРОХІ ПАСПАЦЬ.
ТАК... ЦЯЖКІ ДЗЕНЬ.
Я ВЕЛЬМІ СТАМІЎСЯ.
ДАБРАНАЧ, РЫК.


ТЫ ДАЎНО ПРАЧНУЛАСЯ? ГЭТА МЕСЦА СТАНОВІЦЦА МІЛЫМ.
ХУХ?
АХ... ТАК. ЯК НІ ДЗІЎНА, ГЭТА МЕСЦА ВЕЛЬМІ ДОБРА АБСТАЛЯВАНА.
Я НАВАТ НЕ ДУМАЛА, ШТО ТУРМА БУДЗЕ ТАК ДОБРА АБСТАЛЯВАНА. ТУТ НЯМА НІЧОГА ДЛЯ ПРЫНЯЦ-ЦЯ РОДАЎ, АЛЕ ТУТ ДАСТАТКОВА ІНСТРУМЕНТАЎ, ЯКІЯ Я МАГЛА Б ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ.
ДУМАЮ, З ЛОРЫ І ДЗІЦЁМ УСЁ БУДЗЕ ДОБРА.
ЯК ТОЛЬКІ Я ПРАВЯ-ДУ ІНВЕНТАРЫЗАЦЫЮ І ЎСЁ ТУТ АРГАНІЗУЮ, МЫ ЗМОЖАМ УСЁ ГЭТА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ. ТУТ НАВАТ ЁСЦЬ ТРОХІ КНІГ ПА МЕДЫЦЫНЕ, ЯКІЯ Я ЗБІРАЮСЯ ПРАЧЫТАЦЬ.
МНЕ ЯШЧЭ МНОГАМУ ТРЭБА НАВУЧЫЦЦА.
У ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ, Я КЭРАЛ. МАЦІ САФІ. НЕ ДУМАЮ, ШТО Ў НАС БЫЛА МАШЧЫМАСЦЬ ПАЗНАЁМІЦЦА ЦІ ПАРАЗМАЎЛЯЦЬ.
ТАК... ПРАБАЧ. ЛІЧУ, ГЭТА МАЯ ВІНА. У ВУДБЭРЫ НАС БЫЛО ДАСТАТКОВА ШМАТ, КАБ НЕ ЛІЧЫЦЬ, ШТО МЫ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ КОЖНАГА.
Я ЎВОГУЛЕ МАЛА З КІМ РАЗМАЎЛЯЛА З ТЫХ ЧАСОЎ, ЯК МЫ ПРЫЙШЛІ СЮДЫ.
Я ЗВЫЧАЙНА САМА САБЕ ПАНІ.
О, НЕ ХВАЛЮЙСЯ. НІХТО НЕ ПАКРЫЎДЗІЎСЯ... ВА ЎСЯЛЯКІМ ВЫПАДКУ НЕ Я. Я ПРОСТА ХАЦЕЛА ПАЗНАЁМІЦЦА
ВІДАЦЬ, ТЫ ДОБРЫ ЧАЛАВЕК.
ДЗЯКУЙ.
НАПЭЎНА, МЫ ДОБРА ЗЛАДЗІМ.


ТЫ ЎЖО АПРАНУЛАСЯ, ПАТРЫЦЫЯ?
ТАК, УВАХОДЗЬ.
ТЫ Ў ПАРАДКУ? Я ПРОСТА ХАЦЕЎ ПРАВЕДАЦЬ ЦЯБЕ. МЫ ЎЖО ДАЎНО НЕ РАЗМАЎЛЯЛІ.
З ТАБОЙ УСЁ ДОБРА?
КАНЕШНЕ, БІЛІ. Я ПРОСТА ДУМАЛА ПРА ОЦІСА. ЯГО СМЕРЦЬ МАЛА КАГО РАСХВАЛЯВАЛА... НАПЭЎНА, ЛЮДЗІ ПРОСТА ПРЫВЫКЛІ ДА ГЭТАГА. І ТЫМ НЕ МЕНЬШ... ГЭТА НЕПРЫЕМНА.
БОЛЬШУЮ ЧАСТКУ ЧАСА ЁН БЫЎ ПОЎНЫМ МУД-ЛОМ... АЛЕ ТУТ ЁН БЫЎ МАІМ САМЫМ БЛІЗКІМ СЯБРАМ.
ПРАБАЧ НАС. МАЙГО БАЦЬ-КУ, МЯНЕ... МЭГІ. МЫ БЫЛІ, ЯК УСЕ АСТАТНІЯ, ЗЛАВАЛІСЯ З-ЗА ТАГО, ШТО ТЫ ЗВЯЗАЛАСЯ З ТЫМІ ЗНЯВОЛЕННЫМІ, АЛЕ ЎСЕ МЫ КАЛІСЬЦІ РАБІЛІ ТОЕ, АБ ЧЫМ ПОТЫМ ШКАДАВАЛІ. НІХТО НЕ ІДЭАЛЬНЫ.
МЫ ЎСЁ ЯШЧЭ ТВАЕ СЯБРЫ.
ТЫ ЖА Ж ПРЫЙДЗЕШ НА СВЯТКАВАННЕ ШЛЮБУ МАЁЙ СЯСТРЫ?
ХІБА МЯНЕ ЗАПРАСІЛІ?
МЯНЕ ТАКСАМА НІХТО НЕ ЗАПРАШАЎ, АЛЕ Я Ж БУДУ ТАМ. ВІДАЦЬ, ЯНЫ ВЫРАШЫЛІ, ШТО ЎСЕ І ТАК ПРЫЙДУЦЬ.
БЕЗ ЗАПРАШЭННЯЎ, РАЗУМЕЕШ? ТАМУ... ТЫ ПРЫЙДЗЕШ? Я ВЕДАЮ, МЭГІ ХОЧА, КАБ ТЫ БЫЛА ТАМ... БЫЎ ЧАС, КАЛІ ТЫ БЫЛА ЁЙ ЯК МАЦІ... ЦІ ВА ЎСЯЛЯКІМ ВЫПАДКУ, ЯК СТАРЭЙШАЯ СЯСТРА.
Я НЯ ВЕДАЮ.
А КАЛІ?



КАЛІ РАЗМАЎЛЯЮ Я НА МОВЕ ЧАЛАВЕЧАЙ І АНГЕЛЬСКАЙ, АЛЕ НЯМА Ў МЯНЕ ЛЮБВІ, ТАДЫ Я ЎСЯГО ТОЛЬКІ РЭХА ЦІ ЗВОН ПУСТЫ. КАЛІ ЁСЦЬ У МЯНЕ ДАРУНАК ПРАДБАЧАННЯ І МАГУ ДАВЕДАЦЦА ПРА ЎСЕ ТАЙНЫ, КАЛІ Ў МЯНЕ ЁСЦЬ ВЕРА, ЗДОЛЬНАЯ ЗВАРУШЫЦЬ ГОРЫ, АЛЕ НЯМА ЛЮБВІ, Я НІШТО.
ЛЮБОЎ ДОБРАЯ. ЁЙ НЕ ЗАЙЗДРОСЦЯЦЬ, ЁЙ НЕ ГАНАРАЦЦА. ЛЮБОЎ НЕ ПРЫЕМНАЯ ЗЛУ, АЛЕ РАДУЕ ІСЦІНУ. ЯНА ЗАЎСЁДЫ АБАРАНЯЕ, ЯНА ПРАЎДЗІВАЯ, ЯНА ЗАЦЯТАЯ.
ГЭТАЯ ПАРА ГАТОВА ПРЫНЕСЦІ СВАЕ КЛЯТВЫ.
МЭГІ, ЛЮБОЎ МАЯ, Я КЛЯНУСЯ БЕРАГЧЫ ЦЯБЕ І ПАВАЖАЦЬ... БЕРАГЦІ І АБАРАНЯЦЬ ЦЯБЕ... ЭММ... І Я КЛЯНУСЯ КАХАЦЬ ЦЯБЕ І РАБІЦЬ УСЁ, ШТО Ў МАІХ СІЛАХ, КАБ ГЭТА ПРАЦЯГВАЛАСЯ ЯК МАГА ДОЛЬШ.
СЁННЯ, У СВЯТОЧНЫ ДЗЕНЬ ЛЮБВІ, Я КЛЯНУСЯ ЗЛУЧЫЦЬ СВАЁ ЖЫЦЦЁ З ТВАІМ. У ГОРА ЦІ Ў РАДАСЦІ, Я ХАЧУ, КАБ МЫ ПРАВЯЛІ ЯГО РАЗАМ.
МЭГІ, ЦІ БЯРЭШ ТЫ ГЭТАГА МУЖЧЫНУ Ў СВАЕ ЗАКОННЫЯ МУЖЫ, КАБ ПАВАЖАЦЬ ЯГО І КЛАПАЦІЦЦА ПРА ЯГО ПАКУЛЬ СМЕРЦЬ НЕ РАЗЛУЧЫЦЬ ВАС?
ТАК.
ГЛЕН, ЦІ БЯРЭШ ТЫ ГЭТУЮ ЖАНЧЫНУ Ў СВАЕ ЗАКОННЫЯ ЖОНЫ, КАБ ПАВАЖАЦЬ ЯЕ І КЛАПАЦІЦЦА ПРА ЯЕ ПАКУЛЬ СМЕРЦЬ НЕ РАЗЛУЧЫЦЬ ВАС?
ТАК.
ТАДЫ ЎЛАДАЙ, ЯКУЮ МНЕ ДАЛІ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ АБСТАВІНЫ НАШАГА ЖЫЦЦЯ І БОГ... АБ'ЯЎЛЯЮ ВАС **МУЖАМ І ЖАНОЙ**.
МОЖАШ ПАЦАЛАВАЦЬ НЯВЕСТУ.



БЫЛО НЯ ДРЭННА... У СЭНСЕ... ГЭТА БЫЛА ДОБРАЯ ЦЭРЫМОНІЯ. ЛЕПШ, ЧЫМ Я МОГ САБЕ ЎЯВІЦЬ.
АГА... МАЯ «СУКЕНКА» БЫЛА ПРОСТА ЦУДОЎНАЙ.
ХЕХ, ТАК... ГЭТА БЫЛО ЯК У ГІСТАРЫЧНЫХ КНІГАХ.
ТАК...
ТАК... ЖАНАТЫ.
МЫ ЦЯПЕР ЖАНАТЫ, ТАК?
ХАДЗІ СЮДЫ, МУЖАНЁК!
УФ!
А?
МІЧОНІ?
ШТО ТЫ...
...РОБІШ?


ПАСУЙ! НУ ЖА!
Я СВАБОДНЫ... МЫ НЕ МОЖАМ ДАЗВОЛІЦЬ ГЭТЫМ ДЗЯЎЧЫНКАМ ПЕРАДОЛЕЦЬ НАС.
THAP!
ЛАЙНО!
ВЫ НЕ ТОЕ, ШТО НЕ ПЕРАШКАДЖАЕЦЕ НАМ ПЕРАМАГЧЫ... ВЫ САМІ НАМ ДАПАМАГАЕЦЕ!
ПЕРАСТАНЬ! КІНЬ МЯЧ, СЯСТРЫЦА!
НУ ЎЖ НЕ, БІЛІ.
АНДРЭА... ЛАВІ!
ЗАРАЗ БУДЗЕ ЯШЧЭ АДНО АЧКО!
ДАВАЙЦЕ, ДЗЯЎЧЫНКІ! ДАВАЙЦЕ! ВЫ ЗМОЖАЦЕ! ПЕРАМАЖЫЦЕ ІХ! ПЕРАМАЖЫЦЕ!
ЯНА ЗНАЙШЛА ЯШЧЭ БОЛЬШ АДЗЕЖЫ. ВОСЬ АДКУЛЬ У ІХ ШОРТЫ І ФУФАЙКІ. ТУТ ЗАХОЎВАЛАСЯ СПАРТЫЎНАЯ АДЗЕЖА ДЛЯ ЗНЯВОЛЕНЫХ. ЯНЫ ЗНАЙШЛІ СПАРТЫЎНЫЯ ШТАНЫ І ЯШЧЭ ШМАТ УСЯКАГА РЫЗЗЯ.
БОЖА МОЙ.
ТАК?
АНДРЭА КАЖА, ШТО Ў ЯЕ ЦЯПЕР ДАСТАТКОВА МАТЭР'ЯЛА, КАБ УЖО МОЖНА БЫЛО ПАЧАЦЬ ШЫЦЬ АДЗЕЖУ. ЯНА ЗБІРАЕЦЦА ПАШЫЦЬ НЕКАЛЬКІ ЗІМНІХ ПАЛІТО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ПРАСІЛА МЯНЕ ДАПАМАГЧЫ ЁЙ. ЯК ТОЛЬКІ ЯНА ПАКЛАПАЦІЦЦА ПРА АДЗЕЖУ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ, ЯНА ПАЧНЕ ШЫЦЬ ДЛЯ НАС.
ТАК... ДУМАЮ, У ЯЕ БУДЗЕ ШМАТ РАБОТЫ.
СПАДЗЯЮСЯ, ЯНА ЗШЫЕ АДЗЕЖУ ДЛЯ ЦЯЖАРНЫХ. РАЗГУЛЬВАЦЬ ВОСЬ ТАК ЗУСІМ НЕ ВЕСЕЛА.
ТАТА, А ЧАМУ ТЫ НЕ ГУЛЯЕШ? ТЫ Б НАДЗЁР ІМ АЗАДКІ.
ОХ. Я ЗАБЫЎ.
ПРАБАЧ.
УСЁ НАРМАЛЬНА, СЫНОК. НЕ ЗАСМУЧАЙСЯ. Я Ў ПАРАДКУ.
НЯХАЙ ГЭТА НЕ БЯНТЭЖЫЦЬ ЦЯБЕ.
ОКЕЙ, ТАТА.


ДОБРА... ШТО Ў НАС ЁСЦЬ?
ДЗЕСЯЦЬ ВІНТОВАК, ЧАТЫРЫ ДРАБАВІКА, ДЗЕСЯЦЬ ДУБІНАК, НЕКАЛЬКІ ШОКЕРАЎ І ЗНАЧНА МЕНЬШ БОЕПРЫПАСАЎ, ЧЫМ Я ЛІЧЫЎ... ТАК САМА Ў НАС ЁСЦЬ ВОСЕМ АБАРОНЧЫХ КАСЦЮМАЎ, НЕ ЎЛІЧВАЮЧЫ ТАГО, ШТО НА ГЛЕНЕ.
ВОСЬ ПАРА ПІСТАЛЕТАЎ. НАМ ТРЭБА ПРАВЕРЫЦЬ, ЦІ ПАДОЙДУЦЬ ГЭТЫЯ КУЛІ ДА НАШАЙ ЗБРОІ... ПАШУКАЕМ ТАКІЯ Ж, ЯК МЫ ЎЗЯЛІ Ў КРАМЕ СА ЗБРОЯЙ У АТЛАНЦЕ.
МАБЫЦЬ, ВОЗЬМЕМ З САБОЙ?
НЯ ВЕДАЮ... АЛЕ ЎКЛЮЧАЦЬ ГЕНЕРАТАР, КАБ ПАГЛЯДЗЕЦЬ НА ЗБРОЮ, ГЭТА БЕСКАРЫСНАЯ СТРАТА ПАЛІВА... НАМ ТРЭБА СПЯШАЦЦА.
НЕ ХВАЛЮЙСЯ, ДЗЕЦІ І ЎСЕ АСТАТНІЯ ГЛЯДЗЯЦЬ ТЭРНЕРА І ХУЧА... У НАС ЁСЦЬ УСЯГО ПАЎТАРЫ ГАДЗІНЫ... ПАКУЛЬ ФІЛЬМ НЕ СКОНЧЫЦЦА.
Я ПАДУМАЎ, КАЛІ ЎЖО НАМ УСЁ РОЎНА ТРЭБА АГЛЯДЗЕЦЬ ТУТ УСЁ... ТАДЫ ЯНЫ ТАКСАМА МАГЛІ Б ТРОХІ ПАЦЕШЫЦЦА.
ГЭТАГА НЕ ДАСТАТКОВА.
ШТО ТЫ МАЕШ НА ЎВАЗЕ, ДЭЙЛ?
ГЭТАГА МАЛА. ТОЕ, ШТО ТЫ РАСКАЗАЎ ПРА ВУДБЕРЫ... МЫ ПРОСТА НЕ ЗМОЖАМ АБАРАНІЦЬ СЯБЕ.
ТЫ КАЗАЎ, ШТО Ў ІХ НА КОЖНЫМ ПЛОЦЕ СТАІЦЬ АХОВА, ЯКАЯ ДОБРА АБАРАНЯЕЦЦА З ВІНТОЎКАЙ... ЯКАЯ ГАТОВА АБАРАНІЦЬ ТОЕ МЕСЦА? КОЛЬКІ ІХ? ДЗЕСЯЦЬ? ДВАЦЦАЦЬ?
А МЫ З БОЛЬШАГА ПРОСТА СІДЗІМ ЗА ПЛОТАМ І ВЕРАБ'ЯМ ДУЛІ ПАКАЗВАЕМ... МЫ НЕ ПАДРЫХТАВАНЫЯ ДА ГЭТАГА... Я ВЕДАЎ ГЭТА... АЛЕ ЗАРАЗ МНЕ СТАЛА АБСАЛЮТНА ЗРАЗУМЕЛА...
У НАС НЕДАСТАТКОВА ЗБРОІ, КАБ ЗРАБІЦЬ ГЭТА, НАВАТ КАЛІ Б МЫ БЫЛІ ГАТОВЫЯ ДА ГЭТАГА.
НЕ МАГУ СКАЗАЦЬ, ШТО НЕ ЗГОДНЫ З ТАБОЙ, АЛЕ ШТО ЯШЧЭ МЫ МОЖАМ ЗРАБІЦЬ? Я НЕ ВЕДАЮ.
ТАК... МАБЫЦЬ У ЦЯБЕ ЁСЦЬ ІНШЫЯ ІДЭІ?
ТАК, ЁСЦЬ АДНА.
БАЗА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГВАРДЫІ. КАЛІ ЯНА ТАК БЛІЗКА АД ГЭТЫГА ГОРАДА... МЫ ЗМОЖАМ ЗНАЙСЦІ ЯЕ... І ЎЗЯЦЬ ТОЕ, ШТО ЯНЫ ЯЧШЭ НЕ ЗАБРАЛІ.
АЛЕ МЫ НЕ ВЕДАЕМ, ДЗЕ ЯНА. МОЖА СПАТРЭБІЦЦА ШМАТ ЧАСУ НА ПОШУКІ.
КАЛІ ЯНЫ ШУКАЮЦЬ НАС, ТАДЫ ЧАМУ Б НАМ НЕ ПАШУКАЦЬ ЯЕ.
КАЛІ МЫ НЕ ЗНОЙДЗЕМ БОЛЬШ ЗБРОІ - НАС УСІХ ЗАБ'ЮЦЬ.
ЗГОДНЫ... НАМ ТРЭБА ЕХАЦЬ І ЧЫМ ХУТЧЭЙ, ТЫМ ЛЕПШ.


ШТОСЬЦІ МНАГАВАТА ЕЖЫ ДЛЯ АДНОЙ ПАЕЗДКІ, РАЗУМЕЕЦЕ АБ ЧЫМ Я?
МЫ ПРОСТА СПРАБУЕМ БЫЦЬ ГАТОВЫМІ ДА ЎСЯГО. МЫ Ж НЕ ВЕДАЕМ, ЯК ДОЎГА МЫ БУДЗЕМ ШУКАЦЬ ГЭТА МЕСЦА.
Я ЎСЁ ЯШЧЭ ЛІЧУ, ШТО Я ТАК САМА ПАВІНЕН ЕХАЦЬ З ВАМІ.
ВЕДАЮ, АЛЕ ХТО ТАДЫ БУДЗЕ ПРЫГЛЯДВАЦЬ ЗА БЛІЗНЯТАМІ, КАЛІ МЫ АБОДВА ЎЕДЗЕМ? Я НЕ ХАЧУ ЗАСТАЎЛЯЦЬ ІХ АДНЫХ... ТОЛЬКІ НЕ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ЯНЫ СТРАЦІЛІ СВАІХ БАЦЬКОЎ І Я НЕ ЗБІРАЮСЯ БРАЦЬ ІХ З САБОЙ.
АКРАМЯ ТАГО... ТАЙРЫС ДОБРА КІРУЕ АЎТОБУСАМ, І НІХТО НЕ СТРАЛЯЕ ТАК ДОБРА, ЯК Я. ТАК БУДЗЕ ЛЕПШ... САМ ВЕДАЕШ.
ВЕДАЮ, ВЕДАЮ. АЛЕ МНЕ ЎСЁ РОЎНА ГЭТА НЕ ПАДАБАЕЦЦА. ТАБЕ БЫЛО Б ЛЕПШ ВЯРНУЦЦА ДА МЯНЕ. ЗРАЗУМЕЛА?
НЕ ХВАЛЮЙСЯ, Я БУДУ Ў ПАРАДКУ.


УПЭЎНЕНА, ШТО ХОЧАШ ПАЙСЦІ З НАМІ?
ДУМАЕШ, Я ХАЧУ ЗНОЎ АКАЗАЦЦА ДАЛЁКА АД СВАЙГО МУЖА... АДРАЗУ ПАСЛЯ ВЯСЕЛЛЯ? НЕ. КАЛІ ТЫ ІДЗЕШ... ТАДЫ І Я ІДУ.
ДОБРА, У ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ Я РАДЫ, ШТО МЫ БУДЗЕМ РАЗАМ. ЯК КАСЦЮМ, ПАДЫЙШОЎ?
ЖАХЛІВА... ЁН ЗАНАДТА ВЯЛІКІ ДЛЯ МЯНЕ, АЛЕ Я ЗЛАДЖУ. ШТОСЬЦІ Я НЕ ЗАЎВАЖЫЛА, КАБ ХТОСЬЦІ ЯШЧЭ АПРАНУЎ ХАЦЯ Б АДЗІН... ЯНЫ НЕ ВЕЛЬМІ ПРЫДАТНЫЯ.
САПРАЎДЫ ХОЧАШ ПАЕХАЦЬ?
ПАСЛЯ ЎСЯГО, ПРАЗ ШТО ТЫ ТОЛЬКІ ШТО ПРАЙШЛА?
ХТОСЬЦІ Ж ПАВІНЕН ПРЫГЛЯДВАЦЬ ЗА ВАМІ... ПРЫКРЫВАЦЬ ВАШЫЯ АЗАДКІ. НЕ КЛАПАЦІСЯ ЗА МЯНЕ.
ДУМАЮ, ЦЯПЕР МЫ ЎСЕ САБРАЛІСЯ. МОЖАМ ВЫЯЗДЖАЦЬ У ЛЮБЫ МОМАНТ.
Я ПАКЛІЧУ ЎСІХ, КАБ МЫ МАГЛІ ПРАВЕСЦІ ВАС ПЭЎНЫМ ЧЫНАМ.
Я ЗАВЁЎ РУХАВІК, КАБ ФУРГОН ПРАГРЭЎСЯ.
НЕ МАГУ ПАВЕРЫЦЬ, ШТО РАБЛЮ ГЭТА ЗНОЎ...


НУ І СМУРОД ТУТ.


ВОСЬ ЛАЙНО.
Я АДЧУВАЮ СЯБЕ БЕСКАРЫСНЫМ. Я НЕ МАГУ НІЧОГА ЗРАБІЦЬ, НУ, АМАЛЬ НІЧОГА.
Я АДЧУВАЮ ВІНУ. ВЕДАЮ, ШТО Я НЕ ПАВІНЕН, АЛЕ НІЧОГА НЕ МАГУ З ГЭТЫМ ЗРАБІЦЬ. ВЕДАЮЧЫ, ШТО ЯНЫ ТАМ, РЫЗЫКУЮЦЬ СВАІМІ ЖЫЦЦЯМІ, ШУКАЮЦЬ ГЭТУЮ БАЗУ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГВАРДЫ... Я АДЧУВАЮ, ШТО ПАВІНЕН БЫЦЬ ТАМ.
Я ПАВІНЕН БЫЦЬ З ІМІ.
ТЫ ЗБІРАЕШСЯ СПАЦЬ?
ТАК, ТОЛЬКІ СКОНЧУ ПЕРАВЯЗВАЦЬ РУКУ. ЭЛІС СКАЗАЛА, ШТО Я НЕ ДАСТАТКОВА ЧАСТА МЯНЯЮ БІНТЫ.
МЕНЬШ ЗА ЎСЁ МНЕ ЗАРАЗ ПАТРЭБНА ІНФЕКЦЫЯ.
РЫК, Я...
...
ТАК?
ЛОРЫ? УСЁ ДОБРА?


МНЕ ТРЭБА ПАГАВАРЫЦЬ З ТАБОЙ АБ ШЭЙНЕ.


NEXT ISSUE
Prepare for war...
ПРАЦЯГ НА ComicsBY.by БУДЗЕ!